### ЗАКЛІК ВЫКАНКОМА МІНСКАГА САВЕТА ДА САЛДАТ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫБАРАЎ ДЭЛЕГАТАЎ У САВЕТ

**10 сакавіка 1917 г.**

Таварышы салдаты г. Мінска! Выканаўчы камітэт Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў заклікае вас неадкладна і дружна арганізавацца. У арганізацыі — сіла новай Расіі. Асцерагайцеся разладаў і сутыкненняў. Ворагі новага ладу выкарыстаюць усякае замяшанне ў нашым асяроддзі. Прыступайце да выбараў дэлегатаў, калі яны яшчэ не выбраны вамі. Будзем цвёрда ўпэўнены, што пажаданні Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, прасякнутыя імкненнем зрабіць салдата свабодным грамадзянінам, здзейсняцца ў самай блізкай будучыні. Будзем упэўнены, што права арганізавацца будзе прызнана і за нашымі таварышамі на фронце, будзе пацверджана недатыкальнасць дэлегатаў, будзе адменена неадпаведнае духу часу ўстаўванне ў фронт па-за службай.

Будзем захоўваць спакой, таварышы, у свядомасці нашай сілы.

Выканаўчы камітэт Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

*Друкуецца ў перакладзе з рускай мовы паводле кн.: Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 1. С. 90, 91—93, 105—106.*

## Камітэт грамадскай бяспекі

16—17.3.1917 г. на агульнагарадскім сходзе, дзе прысутнічала каля 70 кіраўнікоў губернскіх і павятовых земстваў, думскай управы, камітэтаў Усерасійскага земскага саюза і Саюза гарадоў і іншых, быў створаны часовы грамадскі орган улады — Мінскі камітэт грамадскай бяспекі. Сход вылучыў арганізацыйную камісію для вызначэння прадстаўніцтва ў камітэце, прыняў адозву да насельніцтва горада, абраў грамадскім камендантам старшыню Мінскай губернскай земскай управы П.М.Самойленку. Усе мерапрыемствы былі ўзгоднены з галоўнакамандуючым Заходнім фронтам генералам Эвертам.

На 17 сакавіка ў камітэт уваходзілі больш за 100 прадстаўнікоў ад сацыяльных і нацыянальных пластоў, канфесійных груп, буйнейшых дзяржаўных і грамадскіх установаў, а таксама Мінскага Савета рабочых дэпутатаў; пры грамадзянскім камітэце быў утвораны рабочы орган з 10 чалавек на чале з гарадскім галавой С.Б.Хржанстоўскім. Рабочы орган займаўся арганізацыйнымі, інфармацыйнымі, праваахоўнымі і іншымі пытаннямі. 20 сакавіка на сумесным сходзе гарадской думы і членаў Мінскага камітэта грамадскай бяспекі быў створаны выканаўчы камітэт (або гарадскі савет). У яго склад абралі М.А.Міхайлава (М.В.Фрунзе), П.В.Шлегеля, І.В.Цеўміна (ад Мінскага Савета рабочых дэпутатаў), П.П.Аляксюка (ад беларусаў), Е.С.Хургіна, С.М.Каплана (ад яўрэйскага насельніцтва), В.Я.Янчэўскага (ад польскага насельніцтва), С.П.Каваліка (ад рускага насельніцтва), а таксама С.Б.Хржанстоўскага, М.Г.Парфіяновіча, М.В.Доўнар-Запольскага, В.Ф.Цывінскага, Э.Ф.Амбрашкевіча, Н.В.Ярохава (гарадскі сакратар), прапаршчыка Гэншэля (ад Мінскага гарнізона), служачых заходнефрантавога камітэта Усерасійскага земскага саюза С.В.Басіста, А.П.Краўчанку. Камітэт узначаліў Хржанстоўскі, які адначасова быў абраны камісарам. Атрымаўшы прызнанне штаба Заходняга фронту, губернскага камісарыята, грамадскіх арганізацый, а таксама падтрымку насельніцтва, камітэт за першыя тыдні свайго існавання забяспечыў нармальную жыццядзейнасць горада. У яго кампетэнцыю былі перададзены пытанні аховы парадку, узаемаадносін паміж ваеннымі і дзяржаўнымі ўладамі і грамадскімі арганізацыямі. Па меры папаўнення гарадской думы прадстаўнікамі нацыянальных дыяспар і партыйных арганізацый рос і яе аўтарытэт. У сувязі з гэтым дзейнасць Мінскага камітэта грамадскай бяспекі звузілася да адна-, двухразовых у месяц пасяджэнняў яго выканкома з мэтай вырашэння сацыяльна-эканамічных, бытавых і іншых праблем, што набывалі палітычную афарбоўку і таму патрабавалі ўмяшання грамадскіх арганізацый. Пасля 30 ліпеня Мінскі камітэт грамадскай бяспекі як першая спроба рэвалюцыйных пераўтварэнняў і народаўладдзя ў Мінску саступіў месца дэмакратычна абранаму гарадскому самакіраванню ў асобе гарадской думы.

*М.Я.Сяменчык.*